***Грыгаровіч, В.І.***
*студэнт 1 курса*
*Навуковы кіраўнік: Н.Я. Трыфанава*

# ПРЫЧЫНЫ І ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ “ГОТЫКІ” Ў БЕЛАРУСІ

**Прычыны развіцця “готыкі” ў Беларусі**. З другой паловы XVIII стагоддзя ў Еўропе ўзнікае цікавасць да сярэднявяковай готыкі. Калі з эпохі Адраджэння да гэтага часу готыку ўспрымалі як варварскую, недарэчную, дысгарманічную, то з другой паловы XVIII стагоддзя на яе пачынаюць глядзець як на духоўна-эстэтычную каштоўнасць [4, с. 114]. Адбываецца асэнсаванне адметнасці сярэднявяковай готыкі ў параўнанні з іншымі архітэктурнымі стылямі, у першую чаргу класіцызму, і звязанае з ім з выкарыстанне гатычных элементаў і форм.

У Беларусі цікавасць да готыкі пачынаецца ў канцы XVIII стагоддзя і доўжыцца да пачатку XX стагоддзя. Максімальнае распаўсюджванне “готыкі” на тэрыторыі Беларусі адбываецца ў канцы XIX стагоддзя.

Адна з асаблівасцей развіцця “готыкі” на Беларусі заключаецца ў тым, што сярэднявяковая готыка на тэрыторыі Беларусі не атрымала шырокага распаўсюджвання. Гэта было звязана з многімі фактарамі. Але тым не менш сярэднявечныя гатычныя пабудовы на тэрыторыі Беларусі ўзводзіліся. Для беларускай готыкі былі характэрны наступныя тыпы храмаў: трохнефны бязвежавы (в. Ішкалдзь, г. Іўе), аднаслупавы бязвежавы (в. Уселюб) і аднанефны аднавежавы (г. Клецк, в. Гнёзна, в. Геранёны).

Развіцце “готыкі” адбывалася ва ўмовах далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай Імперыіі і было звязана з нацыянальна-культурнай самасвядомасцю беларускай і польскай шляхты. “Гатычныя” пабудовы сталі адным з спосабаў нацыянальна-групавой індэтыфікацыі. Для беларускіх палякаў готыка з’яўлялася сімвалам і сінонімам іх лацінскай культуры, сувяззю Польшчы з Захадам, супрацьстаяннем усходняй візантыйскай культуры мясцовага праваслаўнага насельніцтва. Таму зусім не выпадкова, што першыя “гатычныя” пабудовы з’явіліся не ў буйных гарадах і сталіцах, а ў палаца-паркавай архітэктуры загарадных сядзіб шляхты [3, с. 244]. На працэс далейшага развіцця гэтага накірунку аказвалі ўплыў асаблівасці нацыянальна-вызываленчага руху на беларускіх і польскіх землях, адзначанага паўстаннямі 1830–1831, 1848 і 1863–1864 гадоў. Яны ўплывалі на імкненіі шляхецтва да рамантызацыі мінулага, якія знаходзілі ўвасабленне ў “готыцы”. Яшчэ адной прычынай зварота да “готыкі” з’яўлялася рэакцыя на надакучлівы мяшчанска-

казённы класіцызм мікалаеўскага часу з яго жорсткай рэгламентацыяй [3, с. 242] .

Трэба адзначыць, што беларуская “готыка” арыентавалася не толькі на польскую але і на мясцовую сярэднявяковую готыку, што станоўча паслужыла яе развіццю.

Развіццю “готыкі” на тэрыторыіі Беларусі ў культавым дойлідстве спрыяла павелічэнне досведу мясцовых архітэктараў, эканамічны пад’ём, развіццё капіталізму і лібералізацыя рэлігійнай палітыкі ў Расіі [5, с. 152]. Царскія ўказы 1896, 1901 і 1905 годоў афіцыйна пацвярджалі “дазвол на будаўніцтва і аднаўленне малітвенных дамоў і храмаў усялякіх веравызнанняў”. Дзякуючы гэтаму, будаўніцтва касцёльных храмаў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя набыло вельмі хуткія тэмпы [2, с. 7].

Але, у адрозненні ад праваслаўных храмаў, будаўніцтва якіх шчодра фінансавалася ўладамі, каталіцкія храмы будаваліся на ахвяраванні саміх каталікоў. Напрыклад, фундамент касцёла ў Старых Васілішках выкладзены плітамі з імёнымі людзей, якія давалі грошы на будаўніцтва гэтага храма [2, с. 10].

**Этапы развіцця “готыкі” ў Беларусі.** Развіццё “готыкі” ў нашай краіне падзяляецца на два вялікія перыяды.

Першы перыяд – рэтраспектыўна-гатычны. Ён працягваўся з канца XVIII да канца XIX стагоддзя. Гэты перыяд характарызуецца тым, што спачатку зацікаўленнасць готыкай насіла выпадковы, часам неабдуманы характар. Архітэктары спецыяльна не вывучалі готыку, а проста запазычвалі асобныя дэталі і элементы ўжо існуючых сярэднявяковых гатычных пабудоў. Менавіта ў гэты перыяд развіцця “готыкі” характэрна спалучэнне элементаў гатычныга стылю з іншымі стылямі, напрыклад, з раманскім. Архітэктурныя кампазыцыі ў гэты перыяд былі даволі цікавымі і арыгінальнымі, але не заўсёды былі цэльнымі па кампазыцыі [3, с. 240–241].

У рэтраспектыўна-гатычным перыядзе выдзяляюць два этапы, якія адлюстроўваюць розныя стадыі пераасэнсавання сярэднявяковай готыкі.

Першы этап быў звязаны з панаваннем стылю класіцызма ў архітэктуры. Ён характарызуецца ўплывам майстроў рускай і польскай школы на беларускую архітэктуру. На гэтым этапе пачалі з’яўляцца першыя гатычныя рысы ў палаца-паркавай і грамадзянскай архітэктуры. У культавых пабудовах “готыка” шырокага распаўсюджвання не атрымала.

Да канца другога этапа, які пачаўся з 1840-х гадоў, “готыка” ўжо з’яўлялася адной з асноўных архітэктурных плыняў у эклектыцы.

Гатычныя формы і элементы знаходзіліся побач з класіцыстычнымі, барочнымі і рэнесанснымі формамі.

У першы перыяд аднаўлення готыкі выкарыстоўваліся: стральчатая арка, контрфорсы, высокія дахі, ступеньчатыя шчыты і востраканцовыя шпілі [3, с. 244].

Неаготыка – гэта другі перыяд ў развіцці “готыкі”, які пачынаецца ў канцы XIX ст. і доўжыцца да пачатку XX ст. У гэты час неагатычны стыль становіцца асноўным і шырока распаўсюджваецца ў палацава-паркавым і сакральным будаўніцтве. Гэты перыяд характырызуецца тым, што ў адрозненні ад рэтраспектыўна-гатычныга стылю архітэктары адыходзяць ад канонаў сіметрычна-ўраўнаважанай аб’ёмнай кампазыцыі і шырока выкарыстоўваюць дынамічную асіметрыю [3, с. 257]. Неагатычныя храмы і палацы, нягледзячы на свой “дзіўны” выгляд, змаглі арганічна ўвайсці ў беларускі вясковы і гарадскі краявід. Яны характарызаваліся мастацкай цэласнасцю, эстэтызацыяй канструкцый, зваротам да мясцовых традыцый. Невыпадкова, што развіццё неаготыкі супала з працэсам фарміравання беларускай нацыіі, а сама неаготыка стала вядучым стылем архітэктуры ў пачатку XX стагоддзя [5, с. 152]. Распаўсюджванню неаготыкі спрыяла дзейнаць архітэктараў, сярод якіх былі тыя, хто атрымалі адукацыю ў парыжскай Акадэміі архітэктуры і ў Варшаве. Базай праектавання капліц і касцёлаў для губернскіх архітэктараў служылі альбомы праектаў храмаў на ўзоры заходнееўрапейскай архітэктуры, якія былі выдадзены ў Прыбалтыцы і Польшчы [5, с. 157].

Для перыяду неаготыкі характэрны наступныя тыпы храмаў: аднанефавы бязвежавы, аднанефавы аднавежавы, аднанефавы двухвежавы, трохнефавы бязвежавы, трохнефавы аднавежавы і трохнефавы двухвежавы.

Прыкладам аднанефавага бязвежавага храма з’яўляецца касцел ў в. Грандзічы, Гродзенская вобласць, пабудаваны ў 1906 г.

У якасці аднанефавага аднавежавага храма сярод вядомых дванаццаці можна адзначыць касцёл Святога Аляксея ў г.п. Івянец. Ён быў пабудаваны ў 1905–1907 гг. Храм накрыты двухсхільным дахам з сігнатуркай над пяціграннай апсідай, дамінуе двух’ярусная чатырохгранная шатровая вежа-званіца са стральчатым уваходным парталам і акном-ружай над ім.

Таксама можна назваць Касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў в. Дзярэчын (Гродзенская вобласць, 1913 г.). Вертыкальнай дамінантай храма з’яўляецца васьмігранная вежа-званіца з высокім шпілем.

Аднанефавы двухвежавы храм – гэта касцёл у мястэчку Ушачы (Віцебская вобласць), які быў пабудаваны ў 1913 годзе.

Сярод трохнефавых бязвежавых храмаў можна назваць Андрэеўскі касцёл у в. Нарач (Мінская вобласць), які быў пабудаваны ў 1904 годзе, і касцёл у г. Чавусы (Магілёўская вобласць), узведзены ў 1913 годзе. Сцяна галоўнага фасада касцёла у в. Нарач завершана трохгранным шчытом, па вуглах фланкіравана контрфорсамі са шпілямі.

Пры будаўніцтве трохнефавых аднавежавых храмаў дойліды імкнуліся дасягнуць максімальнай цэласнасці ўнутраннай прасторы шляхам пашырэння галоўнага нефа за кошт бакавых нефаў, якія пераўтвараліся ў вузкія праходы. Найбольш пабудоў такога тыпу вядома ў Гродзенскай вобласці (13 храмаў), найменш – у Віцебскай і Гомельскай абласцях (па адным храме).

У якасці прыкладаў трохнефавых аднавежавых храмаў можна адзначыць Троіцкі касцёл у в. Гервяты (Гродзенская вобласць 1899–1903 гг.). У архітэктурнай кампазыцыі асноўную ролю адыгравае вынесеная звонку сістэма аркбутанаў і контрфорсаў. Цэнтральны неф накрыты высокім двухсхільным чарапічным дахам. Фасады аздоблены стральчатамі аркатурамі і нішамі, фланкіраваны шматступеньчатамі контрфорсамі з фіяламі, расчлянёны высокімі стральчатымі вокнамі. Таксама ў якасці прыклада можна адзначыць Троіцкі касцёл у г. Рэчыца (Гомельская вобласць), які быў пабудаваны ў 1903 годзе. Да яго галоўнага фасада далучана трох’ярусная вежа, завершаная шатром-шпілем і ўмацаваная вуглавымі трохступеньчатымі контрфорсамі.

Да прыкладаў трохнефавай двухвежавай базілікі з пяціграннай апсідай, якая стала кампазіцыйным канонам каталіцкіх храмаў перыяду неаготыкі [3, с. 259], але была менш распаўсюджана на Беларусі (у Гродзенскай вобласці былі выяўлены шэсць храмаў такога тыпу, у Віцебскай вобласці – чатыры храмы і ў Мінскай вобласці – два храмы, у Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях храмы такога тыпу не былі выяўлены зусім) можна аднесці Троіцкі касцёл у г. п. Відзы ў Віцебскай вобласці (1909–1914 гг.). З абодвух бакоў фасаду размяшчаюцца дзве шмат’ярусныя ступеньчатыя вежы, завершаныя вострымі васьміграннымі шатрамі. Таксама можна адзначыць касцёл у в. Ракаў, які быў пабудаваны ў 1906 годзе. У архітэктурным афармленні касцёла шырока выкарыстоўваюцца элементы готыкі – ступеньчатыя контрфорсы, высокія стральчатыя вокны і нішы, зубчатыя фрызы і стральчатыя скляпенні.

Адзіны вядомы аднанефавы двухвежавы храм – касцёл у в. Ушачы (Віцебская вобласць), пабудаваны ў 1913 г.

У неагатычнай архітэктуры найбольш яскрава праявілася дынамічнасць архітэктурнай кампазыцыі: у вертыкалях спічастых ніш, аконных праёмаў, шпіляў і ступеньчатых контрфорсаў [1, с. 129]. Вежы храмаў маглі быць складанымі па форме (васьмігранная форма), трох’ярусныя, чатырох’ярусныя і завершаны шатром. Таксама можна адзначыць даволі рэдкія для беларускай “готыкі” гатычныя формы і спосабы архітэктурнага вырашэння: аркбутаны (касцёл у в. Гервяты), абліцоўка храма колатым гранітам (в. Ліпнішкі). Шырокае распаўсюджванне набылі вокны-ружы.

У 1910-я гг. у Беларусі пачаў распаўсюджвацца архітэктурны стыль мадэрн і некаторыя храмы таго часу спалучалі рысы неаготыкі і мадэрна, напрыклад касцёл Ушэсця ў в. Нача, які быў пабудаваны ў 1910 годзе.

* * *

Самыя раннія прыклады звароту да гатычных элементаў і форм ў архітэктуры Беларусі адносяцца да канца XVIII стагоддзя. Працягвалася развіццё “готыкі” да канца 1910-х гг.

Развіццю ”готыкі” на тэрыторыіі Беларусі ў культавым дойлідцтве спрыялі:

1. асэнсаванне сярэднявяковай готыкі як часткі нацыянальнай культурнай спадчыны, якой адпавядала станаўленне нацыянальна-культурнай самасвядомасці беларускай і польскай шляхты;
2. перыяды лібералізацыі рэлігійнай палітыкі ў заходніх абласцях Расійскай Імперыі;
3. дзейнаць архітэктараў, сярод якіх былі рускія майстры XVIII ст., якія пачалі эксперэментаваць з гатычным элементамі на беларускіх землях, і тыя, хто атрымалі адукацыю ў парыжскай Акадэміі архітэктуры і ў Варшаве;
4. існаванне альбомаў праектаў храмаў па ўзоры заходнееўрапейскай архітэктуры, якія служылі базай праектавання капліц і касцёлаў для губернскіх архітэктараў.

Развіццё “готыкі” на Беларусі падзяляецца на два перыяды.

Першы перыяд пачаўся ў канцы XVIII і працягваўся да 1890-х гг. Гэты перыяд называецца рэтраспектыўна-гатычным. На гэтым этапе архітэктары проста запазычвалі асобныя дэталі і элементы ўжо існуючых сярэднявечных гатычных пабудоў.

Другі перыяд ў развіцці “готыкі” атрымаў назву “неаготыка”. Ён пачаўся ў канцы XIX ст. і доўжыўся да пачатку XX ст. Неаготыка шырока распаўсюдзілася як у палаца-паркавым, так і ў сакральным дойлідстве. “Неаготыка” прадстаўлена аднанефавымі бязвежавымі,

аднанефавымі аднавежавымі, аднанефавымі двухвежавымі, трохнефавымі бязвежавымі, трохнефавымі аднавежавымі і трохнефавымі двухвежавымі храмамі. Большасць з іх знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці. Найбольшае распаўсюджванне атрымалі трохнефавыя аднавежавыя, трохнефавыя двухвежавыя і аднанефавыя аднавежавыя храмы. Гатычныя касцёлы гэтага тыпа паслужылі асновай для аднанефавых аднавежавых касцёлаў перыяду неаготыкі. Гэты перыяд характарызуецца імкненнем да дынамічнасці архітэктурнай кампазыцыі: у вертыкалях спічастых ніш, аконных праёмаў, шпіляў і ступеньчатых контрфорсаў.

**Крыніцы і літаратура:**


1. Кох, В. Энциклопедия архитектурных стилей / В. Кох. – М., 2008 – 528 с.
2. Кулагін, А. М. Адраджэнне готыкі / А.М. Кулагін. – Мінск, 1993. – 71 с.
3. Кулагін А. М. Сакральна-манументальнае дойлідства другой паловы XIX – пачатку XX ст. / А. М. Кулагін // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. Т.3. Кн.2 – Мінск, 2007 – 549 с.
4. Кулагін А. М. Эклектыка / А.М. Кулагін – Мінск: Ураджай, 2000 – 302 с.
5. Харэўскі С. В. Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі / С.В. Харэўскі. – Вільня : ЕГУ, 2007 – 275 с.